Аўтар: Кінга Красіцкая
07.02.2016 01:00

Рым пратэстуе

Сотні тысяч асоб прынялі ўдзел у дэманстрацыі на вуліцах сталіцы Італіі супраць легалізацыі гомасексуальных саюзаў.

Дэманстрацыя арганізавана ў межах “Family Day”. На транспарантах удзельнікаў размясціліся, сярод іншых, дэвізы: “Зло застаецца злом, нават калі яно ўзаконена” і “Не гомасексуальным «сужэнствам»”. Аднак арганізатары падкрэслілі, што іх мэта – не выступленне супраць кагосьці, а абарона сям’і.

У пратэсце таксама прынялі ўдзел прадстаўнікі італьянскіх дыяцэзій. Дэманстранты патрабавалі адхілення законапраекта, які легалізуе гомасексуальныя саюзы разам з прызнаннем права на ўсынаўленне імі дзяцей, што ў гэтыя дні і абмяркоўвае італьянскі Сенат. Супраць гэтага выказваецца большасць італьянцаў. †

15 тысяч камплектаў
літургічнай вопраткі
для СДМ-2016

Прыблізна такая колькасць камплектаў літургічнай вопраткі святароў рыхтуецца да галоўнай літургічнай падзеі Сусветных дзён моладзі ў Кракаве – Святой Імшы Паслання, якую 31 ліпеня 2016 года на “Campus Misericordiae” ўзначаліць папа Францішак.

Літургічная вопратка біскупаў і святароў сваёй сімволікай будзе спасылацца на Сусветныя дні мола-дзі ў Кракаве. Іх колькасць і выразнасць, безумоўна, паўплываюць на гэтае вялікае свята Паўсюднага Касцёла. Праект арната падрыхтаваны спецыяльна для Святой Імшы Паслання з папам Францішкам і будзе прадстаўлены непасрэдна падчас яе. Пасля Эўхарыстыі кожны біскуп і святар будзе мець магчымасць забраць яго ў якасці ўспаміну пра Сусветныя дні моладзі ў Кракаве.

Аўтар: Кінга Красіцкая
07.02.2016 01:00



[illegible]